# *§ 49–0. Палітычнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — 1991 гг.

«ХРУШЧОЎСКАЯ АДЛІГА»
ПЕРАБУДОВА КПСС
КПБ ЛКСМБ ААН
САВЕТЫ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ
СУВЕРЭНІТЭТ

## 1. Асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Для палітычнага развіцця БССР у пасляваенны перыяд былі характэрныя тыя ж тэндэнцыі, што і для ўсяго Савецкага Саюза. Адметнасці палітычнай сітуацыі ў БССР на гэтым этапе былі абумоўлены геапалітычным становішчам рэспублікі, узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткае паведамленне наконт дзейнасці БССР у ААН. Якое значэнне для нашай рэспублікі мела дзейнасць на міжнароднай арэне?

**БССР — заснавальнік ААН**

Вызначальным фактарам палітычнага развіцця Беларусі ў пасляваенны перыяд выступіла перамога над нацысцкімі захопнікамі, здабытая супольна з іншымі народамі СССР. Пасля Вялікай Айчыннай вайны змяніўся міжнародны статус рэспублікі. Прызнаннем вялікага ўнёску Беларусі ў разгром нацысцкай Германіі і зазнаных у выніку вайны велізарных людскіх і матэрыяльных страт было запрашэнне БССР стаць членам-заснавальнікам ААН. Беларуская дэлегацыя на чале з наркамам замежных спраў БССР К. В. Кісялёвым падпісала **26 чэрвеня 1945 г.** Статут ААН.

**Аднаўленне органаў улады**

Па меры вызвалення тэрыторыі БССР ад нацысцкіх захопнікаў аднаўляліся партыйныя і савецкія органы ўлады. Першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка, начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху ў 1942–1944 гг., падтрымліваў

Як вы лічыце, якое значэнне мела прызначэнне на кіруючыя пасады ў БССР былых камандзіраў партызанскага руху? Як гэта ўплывала на аўтарытэт улады? На развіццё Беларусі?

тэндэнцыю прызначэння на кіруючыя пасады былых партызанскіх камандзіраў. На іх аснове паступова сфарміраваўся склад кіраўнікоў рэспубліканскага і мясцовага ўзроўню, якіх аб'ядноўвала не этнічнае паходжанне, а агульныя гаспадарчыя і арганізацыйныя інтарэсы.

Найбольш значнай грамадска-палітычнай падзеяй першых пасляваенных гадоў былі выбары ў Вярхоўны Савет СССР (1946 г.) і Вярхоўны Савет БССР (1947 г.). Для беларусаў, якія перажылі вайну, выбары сталіся святам мірнага адраджэння.

### Барацьба з нацыяналістычнымі фарміраваннямі ў заходніх абласцях

Адметнасцю палітычнага развіцця БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе была барацьба супраць нацыяналістычных фарміраванняў у заходніх абласцях рэспублікі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Пасля Вялікай Айчыннай вайны на захадзе рэспублікі дзейнічалі бандфарміраванні з украінскіх і польскіх нацыяналістаў, былых калабарацыяністаў. Іх ахвярамі рабіліся партыйныя і камсамольскія актывісты, урачы, настаўнікі, ваеннаслужачыя. Апошнія бандфарміраванні былі знішчаны органамі ўнутраных спраў толькі ў сярэдзіне 1952 г.

1. *Успомніце, хто такія калабарацыяністы.*
2. *Выкарыстоўваючы дапаможнік «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (10–11 класы), падрыхтуйце паведамленне пра дзейнасць у Заходняй Беларусі польскіх нацыяналістычных фарміраванняў у пасляваенны перыяд.*
3. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткую гістарычную даведку пра барацьбу савецкай міліцыі і органаў дзяржаўнай бяспекі супраць бандытызму ў заходніх абласцях Беларусі.*

### Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця

Ад сярэдзіны 1950-х гг. пачаліся працэсы дэмакратызацыі і адраджэння калектыўных метадаў кіраўніцтва. Пашырыліся правы рэспубліканскай партыйнай арганізацыі, рэгулярнымі зрабіліся з'езды партыі, канферэнцыі і партыйныя сходы. На пасаду першага сакратара ЦК КПБ былі вылучаны беларусы.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



**Кірыла Трафімавіч Мазураў** (1914–1989)
Дзяржаўны і партыйны дзеяч, Старшыня Савета Міністраў БССР (1953–1956 гг.), першы сакратар ЦК КПБ (1956–1965 гг.), першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР (1965–1978 гг.). Герой Сацыялістычнай Працы (1974 г.)



**Пётр Міронавіч Машэраў** (1918–1980)
Дзяржаўны і партыйны дзеяч, першы сакратар ЦК КПБ (1965–1980 гг.). Герой Савецкага Саюза (1944 г.). Герой Сацыялістычнай Працы (1978 г.)

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце кароткую гістарычную даведку пра ролю К. Т. Мазурава і П. М. Машэрава ў барацьбе супраць нацысцкіх захопнікаў, пасляваенным аднаўленні і развіцці рэспублікі.*
2. *Як вы лічыце, чаму менавіта К. Т. Мазураў і П. М. Машэраў былі вылучаныя на вышэйшыя кіруючыя пасады ў БССР?*

### Пашырэнне правоў саюзных рэспублік

У сярэдзіне 1950-х гг. былі значна пашыраныя правы саюзных рэспублік у сферы дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання. У адпаведнасці з новым парадкам урад СССР вызначаў толькі агульныя паказчыкі развіцця. Саюзным рэспублікам было нададзена права вырашаць пытанні заканадаўства аб судаўладкаванні, прымаць грамадзянскі, крымінальны і працэсуальны кодэксы, самастойна прымаць рашэнні адносна свайго адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Гэта паспрыяла больш актыўнай заканадаўчай дзейнасці Вярхоўнага Савета БССР.

### Узмацненне цэнтралізацыі

Ад сярэдзіны 1960-х гг. у СССР пачаўся рост партыйнага і дзяржаўнага апарату. У гэты перыяд узмацнілася цэнтралізацыя кіравання прамысловасцю і сельскай гаспадаркай. Правы і магчымасці рэспубліканскага кіраўніцтва ў розных сферах абмяжоўваліся. Часцяком нават самыя нязначныя змены трэба было ўзгадняць з цэнтральнымі агульнасаюзнымі структурамі.

Назавіце знакавыя помнікі і мемарыялы Беларусі, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

У другой палове 1960-х — 1970-я гг. у Беларусі істотным фактарам грамадскай свядомасці становіц-

ца памяць пра Вялікую Айчынную вайну: будуюцца знакавыя помнікі, якія сімвалізавалі трагедыю і гераізм беларускага народа ў гады вайны.

**Фактары стабільнасці грамадска-палітычнага жыцця ў БССР**

Напачатку 1980-х гг. асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі супадалі з агульнасаюзнымі. Аднак у пачатку перыяду перабудовы БССР заставалася адной з найбольш развітых рэспублік СССР, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у сацыяльна-эканамічным развіцці. У БССР не знізіўся ўзровень вытворчасці; да прыкладу, нацыянальны даход на душу насельніцтва, спажыванне матэрыяльных даброт і паслуг, выраб тавараў народнага спажывання пераўзыходзілі агульнасаюзныя паказчыкі. Аж да канца 1980-х гг. эканоміка БССР працягвала дэманстраваць даволі высокія тэмпы развіцця, таму і грамадска-палітычнае жыццё ў рэспубліцы адрознівалася стабільнасцю.

Ускладніла грамадска-палітычную сітуацыю ў БССР аварыя на Чарнобыльскай АЭС (тэрыторыя Украінскай ССР) 26 красавіка 1986 г. На працягу некалькіх гадоў пасля трагедыі кіраўніцтва СССР лічыла за лепшае трымаць насельніцтва ў няведанні пра яе наступствы, каб пазбегнуць крытыкі з боку грамадства. Кіраўніцтва БССР зрабілася закладнікам такой сітуацыі, яно таксама замоўчвала рэальны ўзровень радыеактыўнага забруджвання тэрыторыі рэспублікі.

**Стаўленне партыйнага кіраўніцтва БССР да перабудовы**

Партыйнае кіраўніцтва БССР у сярэдзіне 1980-х гг. не магло не падтрымаць курс на перабудову, але крытычна ставілася да палітычных пераўтварэнняў, якія праводзіла саюзнае кіраўніцтва, бо лічыла іх паспешлівымі і непрадуманымі.

У 1989 г. першы сакратар ЦК КПБ Я. Я. Сакалоў загадаў апублікаваць карту радыеактыўнага забруджвання Беларусі і выступіў на пленуме ЦК КПСС за пашырэнне паўнамоцтваў рэспублікі. Атачэнне М. С. Гарбачова абвінаваціла кіраўніцтва КПБ у марудных тэмпах рэфармавання.

У такіх умовах у БССР аформіўся апазіцыйны КПБ грамадска-палітычны рух — Беларускі народны фронт (БНФ), але шырокай сацыяльнай базы ў Беларусі ён не меў.

**Выбары ў Вярхоўны Савет БССР на альтэрнатыўнай аснове**

У сакавіку 1990 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР XII скліканне, якія праходзілі на альтэрнатыўнай аснове. У склад Вярхоўнага Савета былі абраныя і дэпутаты ад БНФ. Вярхоўны Савет БССР XII склікання прыняў шэраг законаў: аб пераходзе да рыначнай эканомікі, ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай аварыі, унясенні змен у Канстытуцыю БССР 1978 г. Змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю замацоўвалі шматпартыйнасць, прадугледжвалі роўныя ўмовы дзейнасці розных грамадскіх аб'яднанняў.

**Абвяшчэнне суверэнітэту БССР**

**27 ліпеня 1990 г.** Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

Пры гэтым варта памятаць, што рэальнае набыццё суверэнітэту, фарміраванне яго атрыбутаў, такіх як незалежная ўнутраная і знешняя палітыка, харчовая, ваенная і энергетычная бяспека, праходзілі ад сярэдзіны 1990-х гг. і былі звязаныя з увядзеннем інстытута прэзідэнцтва.

У 1991 г. у СССР паглыбіўся сацыяльна-эканамічны крызіс, што ахапіў усе сферы эканомікі. У гэты час пачаліся забастоўкі рабочых у розных гарадах Беларусі з патрабаваннямі палепшыць матэрыяльнае становішча. Да эканамічных лозунгаў дадаліся палітычныя: дэмакратызацыя грамадска-палітычнага ладу, нацыяналізацыя маёмасці КПСС-КПБ.

Стварэнне ў жніўні 1991 г. Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы (ДКНС) ускладніла сітуацыю ў беларускім грамадстве. На пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР **25 жніўня 1991 г.** былі прынятыя рашэнні аб наданні Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР статусу канстытуцыйнага закона і прыпыненні дзейнасці КПБ.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Канстытуцыя Беларускай ССР** (1978 г.)

Народ Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі,
кіруючыся ідэямі навуковага камунізму,
усведамляючы сябе неад'емнай часткай усяго савецкага народа,

захоўваючы пераемнасць канстытуцыйнага развіцця нашай краіны, ідэй і прынцыпаў Канстытуцыі Беларускай ССР 1919 года, Канстытуцыі Беларускай ССР 1927 года, Канстытуцыі Беларускай ССР 1937 года і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй (Асноўным Законам) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, якая замацавала асновы грамадскага ладу і палітыкі СССР, устанавіла правы, свабоды і абавязкі грамадзян, прынцыпы арганізацыі і мэты сацыялістычнай агульнанароднай дзяржавы,

прымае і абвяшчае гэтую Канстытуцыю.

**Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь**
(27 ліпеня 1990 г., са зменамі 1991 г.)

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь,

выражаючы волю народа Рэспублікі Беларусь,

усведамляючы адказнасць за лёс беларускай нацыі,

пацвярджаючы павагу да гонару і правоў людзей усіх нацыянальнасцей, якія жывуць у Рэспубліцы Беларусь,

выказваючы павагу да суверэнных правоў усіх народаў Саюза ССР і свету,

лічачы рэспубліку паўнапраўным і незалежным членам сусветнай супольнасці,

дзейнічаючы ў адпаведнасці з прынцыпамі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншымі агульнапрызнанымі міжнародна-прававымі актамі,

урачыста абвяшчае поўны дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх зносінах і заяўляе пра рашучасць стварыць прававую дзяржаву.

1. *Параўнайце тэксты Канстытуцыі БССР і Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь. Знайдзіце агульныя і адметныя палажэнні дакументаў. Растлумачце сутнасць змен.*
2. *Якія змены былі ўнесены ў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР пасля 19 верасня 1991 г.?*

**Органы дзяржаўнай улады ў БССР**

**2. Умацаванне беларускай дзяржаўнасці.** Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў БССР працягвала дзейнічаць Канстытуцыя 1937 г. Вышэйшым органам заканадаўчай улады быў Вярхоўны Савет БССР, які абіраўся грамадзянамі тэрмінам на 4 гады. Вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам быў Савет Народных Камісараў БССР (у 1946 г. пераўтвораны ў Савет Міністраў). На месцах кіраванне ажыццяўлялі абласныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы народных дэпутатаў. У 1944 г. у Канстытуцыю БССР былі ўнесеныя папраўкі наконт пашырэння паўнамоцтваў рэспублікі (стварэння рэспубліканскіх наркаматаў абароны і замежных спраў).

Успомніце, якімі гістарычнымі падзеямі былі абумоўлены змены ў Канстытуцыі БССР у 1944 г.

Канстытуцыя БССР 1937 г. дзейнічала да 1978 г. Новая Канстытуцыя замацавала кіраўнічую ролю Камуністычнай партыі.

**Зацвярджэнне дзяржаўных сімвалаў БССР**

**У 1951 г.** адбылося зацвярджэнне новага Дзяржаўнага сцяга БССР. **У 1955 г.** быў зацверджаны Дзяржаўны гімн БССР («Мы — беларусы»).

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

**Дзяржаўны гімн БССР** (1955 г.)

Музыка Н. Сакалоўскага
Словы М. Клімковіча

*…Сілы гартуе люд Беларусі*
*Ў братнім саюзе, у мужнай сям'і.*
*Вечна мы будзем, вольныя людзі,*
*Жыць на шчаслівай, вольнай зямлі!*

*Нас аб'яднала Леніна імя,*
*Партыя к шчасцю вядзе нас у паход.*
*Партыі слава! Слава Радзіме!*
*Слава табе, наш свабодны народ!..*



*Дзяржаўны сцяг БССР. 1951 г.*

*1. Якія асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі знайшлі адлюстраванне ў Дзяржаўным гімне БССР?*
*2. У чым заключаецца пераемнасць дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь і БССР?*

Саветы — палітычная аснова беларускага грамадства

**3. Дзейнасць Саветаў народных дэпутатаў і грамадскіх арганізацый.** Палітычнай асновай савецкага грамадства былі Саветы народных дэпутатаў, якія фарміраваліся ў выніку выбараў. Да канца 1980-х гг. выбары ў Саветы праходзілі на безальтэрнатыўнай аснове.

Заканадаўчая дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР доўгі час была абмежаванай. Шмат у чым фармальнай была роля мясцовых Саветаў народных дэпутатаў. Саветы рэальнай улады не мелі, іх дзейнасць кантралявалася Камуністычнай партыяй. Гэтыя асаблівасці савецкай палітычнай сістэмы — зліццё дзяржаўнага і партыйнага апарату, пераход рэальнай вярхоўнай улады да вышэйшых партыйных органаў — аформіліся яшчэ ў 1930-я гг.

Грамадскія арганізацыі

Успомніце прыклады барацьбы камсамольцаў супраць нацыстаў на тэрыторыі БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Даведайцеся, за якія выдатныя заслугі ЛКСМБ быў узнагароджаны ордэнам Леніна ў 1970 г.

Самай масавай грамадскай арганізацыяй з'яўляліся прафсаюзы. У 1958 г. на заканадаўчым узроўні было прынятае рашэнне, у адпаведнасці з якім рабочыя і служачыя маглі быць звольнены адміністрацыяй толькі са згоды прафсаюзнай арганізацыі.

Другой па масавасці арганізацыяй быў Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі (УЛКСМ, у Беларусі — Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі (ЛКСМБ)). Пераважная частка юнакоў і дзяўчат актыўна ўдзельнічала ў дзейнасці камсамольскай арганізацыі рэспублікі, якая ў 1945 г. была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга за мужнасць і самаадданасць, праяўленыя камсамольцамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Значнай была роля камсамола ў далучэнні моладзі рэспублікі да працэсаў аднаўлення народнай гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны, асваення цалінных і абложных зямель Казахстана, будаўніцтва прамысловых аб'ектаў ва ўсходніх і паўночных рэгіёнах СССР.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У 2023 г. студэнты архітэктурнага факультэта БНТУ стварылі мурал.




*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*
*1. Да якіх дат прымеркавана стварэнне мурала?*
*2. Што азначаюць элементы мурала?*
*3. У чым заключаецца пераемнасць ЛКСМБ і БРСМ?*

**4. Стаўленне да царквы.** У пасляваенны час дзяржаўная канфесійная палітыка зрабілася больш цярпімай. Гэта выявілася ў росце колькасці праваслаўных прыходаў, цэркваў і святароў. Аднаўленне царкоўнага жыцця стала магчымым дзякуючы ўдзелу святароў у барацьбе з ворагам падчас Вялікай Айчыннай вайны.



*Свята-Мікалаеўскі сабор (1843 г.). Г. Віцебск. Узарваны ў 1957 г.*

У гады «хрушчоўскай адлігі» ціск і кантроль за царквой узмацніліся. Былі закрытыя многія храмы і манастыры, знішчаны шэраг помнікаў культавай архітэктуры. Аднак гэта не толькі не прывяло да перамогі атэізму, але, наадварот, выклікала спачуванне да вернікаў. У наступныя гады адбыўся адыход ад надзвычай жорсткай лініі ў дзяржаўна-канфесійных адносінах.

Успомніце, калі была створана Полацкая епархія.

Важнай вяхой у справе адраджэння праваслаўя ў Беларусі было святкаванне ў 1988 г. 1000-годдзя Хрышчэння Русі. Ад гэтага часу пачалося масавае адкрыццё храмаў і стварэнне новых праваслаўных

абшчын. У 1989 г. былі адноўленыя Полацкая, Магілёўская і Мінская епархіі.

**Рост нацыянальнай самасвядомасці**

**5. Вырашэнне нацыянальнага пытання.** Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне прадэманстравала згуртаванасць народаў СССР. У гады ваенных выпрабаванняў адбываўся рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.



Г. Салігорск

На будаўніцтве нафтаперапрацоўчага завода ў Наваполацку і распрацоўцы радовішчаў солі ў Салігорску працавалі прадстаўнікі 20 нацыянальнасцей. Пры гэтым у рэспубліцы не назіралася канфліктаў на нацыянальнай глебе. БССР называлі «самай савецкай» з рэспублік.

У Маскве друкаваліся беларускія газеты, частай з'явай былі вечары беларускай культуры, пленумы беларускай творчай інтэлігенцыі, гастролі беларускіх тэатраў і інш.

У якім годзе адзначалася 40-годдзе ўтварэння БССР?

Згодна з перапісам 1959 г. абсалютная большасць жыхароў БССР (78,92 %) роднай мовай назвала беларускую. На прыёме ў гонар 40-годдзя ўтварэння БССР першы сакратар ЦК КПБ К. Т. Мазураў выступаў з прамовай на беларускай мове.

**Развіццё сацыялістычнага інтэрнацыяналізму**

Але прынятая ў 1961 г. Праграма КПСС абвяшчала мэтай партыі развіццё сацыялістычнага інтэрнацыяналізму як найвышэйшай якасці ўсіх савецкіх людзей. Прадугледжвалася зліццё асобных народаў у адзіную сусветную камуністычную нацыю, а іх моў — у сусветную мову. Фарміраванню інтэрнацыянальных пачуццяў спрыялі інтэнсіўная міграцыя насельніцтва саюзных рэспублік СССР і імклівы рост гарадскога насельніцтва. Узмацняліся пазіцыі рускай мовы ў галіне адукацыі.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Вялікі ўнёсак у захаванне і папулярызацыю беларускай мовы зрабілі «Песняры» — самы вядомы беларускі вакальна-інструментальны ансамбль (створаны ў 1969 г. У. Мулявіным). Рэпертуар ансамбля шмат у чым складаўся з рок-адаптацый беларускіх народных песень і песень, напісаных прафесійнымі кампазітарамі на словы беларускіх класікаў (Янкі Купалы, М. Багдановіча і інш.). «Песняры» актыўна ўдзельнічалі ў этнаграфічных экспедыцыях, збіралі матэрыялы пра беларускую народную музыку, знаёмілі гледача з народнымі музычнымі інструментамі і беларускімі народнымі строямі.



*«Залаты» склад «Песняроў»*



*Уладзімір Мулявін*

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне пра У. Мулявіна.*
2. *Якія песні ансамбля «Песняры», на вашу думку, з'яўляюцца «візітоўкай» Беларусі? Сваю думку растлумачце.*

**Падтрымка беларускай мовы**

Мерамі падтрымкі беларускай мовы з боку партыйнага кіраўніцтва БССР былі заснаванне выдавецтваў «Беларуская Энцыклапедыя» і «Мастацкая літаратура», адкрыццё Мінскага інстытута культуры. Шматтысячнымі тыражамі выходзілі кнігі на беларускай мове, у значнай ступені беларускамоўным заставалася ў БССР рэспубліканскае тэлебачанне і радыё.

У канцы 1970-х — пачатку 1980-х гг. у Беларусі назіраўся рост цікавасці моладзі да гістарычнай мінуўшчыны, беларускай мовы і фальклору, нацыянальнай культуры ў цэлым. Гэта было рэакцыяй на праявы агульнасусветнай тэндэнцыі ўзмацнення нацыянальнай самасвядомасці. Такая з'ява ў значнай ступені звязаная і з тымі станоўчымі працэсамі, якія адбываліся ў нацыянальна-культурным жыцці рэспублікі ў гэты перыяд.

БССР — член-заснавальнік ААН

**6. БССР на міжнароднай арэне.** Прызнаннем вялікага ўнёску БССР у разгром фашысцкай агрэсіі і зазнаных у выніку вайны велізарных людскіх і матэрыяльных страт выступіла запрашэнне БССР у красавіку 1945 г. зрабіцца першапачатковым членам-заснавальнікам новай міжнароднай арганізацыі. Для ўдзелу ў канферэнцыі ў Сан-Францыска з мэтай заснавання ААН была накіраваная дэлегацыя БССР на чале з наркамам замежных спраў К. В. Кісялёвым, якая 26 чэрвеня 1945 г. у ліку 50 іншых дэлегацый падпісала статут гэтай арганізацыі.

Дзейнасць БССР у ААН

На першай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у студзені 1946 г. увагу міжнароднай супольнасці прыцягнулі прапановы дэлегацыі Беларускай ССР наконт выдачы і пакарання ваенных злачынцаў. Было рэкамендавана ўсім урадам зрабіць захады да таго, каб арыштаваць усіх ваенных злачынцаў і выслаць іх у краіны, дзе яны здзейснілі свае злачынствы, для суду ў адпаведнасці з законамі гэтых дзяржаў.

Дзейнасць Беларусі ў рабоце ААН аб'ектыўна мела станоўчае значэнне. Яна спрыяла росту цікавасці ў свеце да гісторыі і культуры беларускага народа, усталяванню і развіццю кантактаў з іншымі краінамі, набыццю дыпламатычнага досведу.

У ліпені — кастрычніку 1946 г. дэлегацыя БССР удзельнічала ў рабоце Парыжскай мірнай канферэнцыі. У лютым 1947 г. міністр замежных спраў СССР К. В. Кісялёў падпісаў у Парыжы дамову аб міры з Балгарыяй, Італіяй, Румыніяй, Венгрыяй і Фінляндыяй.

Зніжэнне міжнароднай напружанасці і пераход савецкага кіраўніцтва на шлях актыўнага супрацоўніцтва з ААН і яе арганізацыямі ў другой палове 1950-х гг. спрыялі таму, што саюзныя рэспублікі атрымалі больш правоў і паўнамоцтваў. У 1958 г. было адкрытае пастаяннае прадстаўніцтва Беларускай ССР пры ААН.

Беларусь абіралася непастаянным членам Савета Бяспекі ААН, у Эканамічны і Сацыяльны савет ААН, удзельнічала ў розных функцыянальных і дапаможных органах ААН. БССР выступіла суаўтарам шэрагу праектаў рэзалюцый па пытаннях раззбраення, зрабілася членам ЮНЕСКА, адным з заснавальнікаў МАГАТЭ.

*Пасля Вялікай Перамогі стваральная праца ўсіх народаў СССР, у тым ліку і беларускага, была накіравана на аднаўленне краіны, стварэнне спрыяльных умоў для далейшага руху наперад у дзяржаўным будаўніцтве, развіцці эканомікі, нацыянальнай культуры і народнага дабрабыту. Галоўным вынікам савецкага перыяду было тое, што беларуская дзяржаўнасць набыла магутны сацыяльна-эканамічны базіс, які забяспечваў далейшы прагрэс рэспублікі. У пасляваенныя гады сфарміраваўся патэнцыял Беларусі як краіны з высокім тэхналагічным узроўнем. На працягу дзесяцігоддзяў вызначыўся сацыяльна арыентаваны характар эканомікі Беларусі.*

**калі ў свеце...**

1 жніўня 1975 г. — у Хельсінкі 35 дзяржаў, у тым ліку СССР, ЗША і краіны Еўропы, падпісалі Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе

**на тэрыторыі Беларусі...**

14 красавіка 1978 г. — прыняцце Канстытуцыі БССР

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Складзіце тэзісны план (або ментальную карту) «Асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага развіцця БССР у сярэдзіне 1940-х — 1991 г.».
2. Канкрэтызуйце фактамі наступны вывад: «Асаблівасці палітычнага развіцця БССР у пасляваенны перыяд былі абумоўлены яе геапалітычным становішчам і дасягнутым узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця».
3. Якую ролю адыгрывалі грамадскія арганізацыі БССР у другой палове ХХ ст.?
4. Пад нацыянальным пытаннем разумеюць сукупнасць палітычных, эканамічных, прававых праблем, якія праяўляюцца ва ўзаемаадносінах паміж рознымі этнічнымі групамі. Прывядзіце аргументы, якія пацвярджаюць вывад: нацыянальнае пытанне ў БССР было вырашана.
5. Ці можна казаць пра гістарычную абумоўленасць міжканфесійнай і міжнацыянальнай згоды ў беларускім грамадстве?